# АПТЫМІЗАЦІЯ МЕТАДЫЧНАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ СТУДЭНТАЎ СПЕЦЫЯЛЬНАСЦІ «КЛАСІЧНАЯ ФІЛАЛОГІЯ»

**Мінкевіч Д.Г.**

Беларускі дзяржаўны універсітэт

**Анатацыя**. Прадстаўлены на Круглы стол даклад разглядае забяспечанасць сучаснымі падручнікамі студэнтаў спецыяльнасці «Класічная філалогія».

**Ключавыя словы**: класічная філалогія, старажытнагрэчаская мова, лацінская мова, падручнік.

Некалькі пакаленняў студэнтаў спецыяльнасці «Класічная філалогія» вывучалі лацінскую і старажытнагрэчаскую мовы па адпаведных кафедральных падручніках: Гарник, А. В. «Латинский язык» [1] і Зарембо, О. С., Тананушко К. А. «Древнегреческий язык» [2]. Згодна з прынятымі ў БДУ правіламі падручнікі са спісу асноўнай літаратуры не могуць быць старэйшымі за пяць гадоў, таму ўжо пэўны час існуе неабходнасць у новых падручніках. На дадзены момант самым новым рускамоўным падручнікам старажытнагрэчаскай мовы (а беларускамоўнага падручніка не існуе) для студэнтаў спецыяльнасці «Класічная філалогія» з’яўляецца апошняе выданне «Учебника древнегреческого языка» М.М. Славяцінскай: трэцяе выданне выйшла ў 2022-м годзе, чацвёртае – ў 2023-м [4]. На першым курсе на вывучэнне старажытнагрэчаскай мовы ў 2021 годзе адводзілася 212 гадзін (106+106 па семестрах) для практычных заняткаў і 16 гадзін для КСР, адпаведна трэба суаднесці вывучэнне дысцыпліны па падручніку М.М. Славяцінскай з навучальнай праграмай. Падручнік складаецца з трох частак: першая (39 урокаў), якую можна разабраць за першы сееместр, другая (23 урокі) і трэцяя (9 раздзелаў) адыходзяць на другі семестр, або для зніжэння тэмпу навучання можна вынесці трэцюю частку на першы семестр другога года навучання і чытаць разам з «Анабазісам» Ксенафонта. Падручнік М.М. Славяцінскай уключае ў сябе не толькі паслядоўную паўрочную сістэму рэпрэзентацыі тэарэтычнага матэр’яла і практычныя заданні, але і дадатковыя заданні, якія можна прапанаваць студэнтам выконваць для атрымання больш высокіх балаў, а таксама гістарычныя і літаратурныя фонавыя экскурсы, якія дапамогуць сыстэматызаваць веды студэнтаў у адпаведных галінах. Можна падсумаваць, што на дадзены момант менавіта падручнік М.М. Славяцінскай – аптымальны для навучання наступнага пакалення студэнтаў-класікаў старажытнагрэчаскай мове. Магчыма, калі мы пазбавімся ад залішняга кансерватызму, мы зможам дадаткова ўжываць падручнікі

старажытнагрэчаскай мовы, пабудаваныя згодна з камунікатыўнай методыкай [5], але тут паўстае пытанне мовы навучання, якое можа быць вырашана альбо праз стварэнне ўласных беларускамоўных падручнікаў адпаведна высокага ўзроўню, альбо праз пераклад і беларускую лакалізацыю існуючых падручнікаў.

Наконт падручніка лацінскай мовы для студэнтаў-класікаў на дадзены момант пытанне застаецца адкрытым: класічныя падручнікі [3] і інш. не адпавядаюць часавым нормам бібліятэкі БДУ, а для ўжытку падручнікаў камунікатыўнага падыходу [6] не спрыяе таксама іх нязвыкласць для выкладчыкаў.

Дысцыпліны класічнага цыклу: гісторыя антычнасці, антычная літаратура, гісторыя класічных моў і г.д. – таксама вымагаюць стварэння або перакладу і лакалізацыі на беларускую мову.

## ЛІТАРАТУРА

1. Гарник, А. В. Латинский язык = Lingua Latina : учебник для студентов учреждений высшего образования по филологическим и историческим специальностям / А. В. Гарник, Г. И. Шевченко. — Минск : БГУ, 2012. — 263 с.

2. Зарембо, О. С. Древнегреческий язык : учебное пособие для студентов учреждений высшего образования по гуманитарным специальностям / О. С. Зарембо, К. А. Тананушко ; под ред. А. В. Гарник. — Минск : БГУ, 2013. — 351 с.

3. Соболевский, С. И. Грамматика латинского языка: теоретическая часть. Морфология и синтаксис : учебное пособие / С. И. Соболевский ; Российская академия образования. – Санкт-Петербург : Алетейя, 1998. – 433 с.

4. Учебник древнегреческого языка : [для преподавателей высшей и средней школы, аспирантов и студентов] / М. Н. Славятинская. – 4-е изд., стер. – Москва : Флинта, 2023. – 731 с. ; 24x17 см. – Библиогр.: с. 729

5. Maurice Balme, Gilbert Lawall, and The late James Morwood. Athenaze. An Introduction to Ancient Greek. / Maurice Balme, Gilbert Lawall, and The late James Morwood. Oxford, 2016. – 464 p.

6. Orberg H.H. Lingua Latina per se illustrata. / Orberg H.H. Kolding, 1991.